Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

1 ЛЮТАГА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 21 (28888)



АПЛАТУ «КАМУНАЛКІ» ПЕРАГЛЕДЗЯЦЬ 2

ЗА ШТО ДАПЛАЦЯЦЬ ПЕДАГОГАМ 3



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі за 2018 год перасягнуў мяжу ў пяць мільярдаў долараў. На гонар сельгасвытворцам, мы забяспечылі багаты ўнутраны спажывецкі стол, а таксама рэалізацыю сваёй прадукцыі, размяняўшы шосты мільярд па экспарце. На гэтую пяцігодку пастаўлены амбіцыйныя задачы: Беларусь планye выйсці на валавы ўнутраны прадукт у памеры, не меншым за 100 мільярдаў долараў, і сельскагаспадарчай галіне неабходна практычна ў 1,5 раза павялічыць аб'ёмы таварнай прадукцыі, каб забяспечыць фінансавыя патрэбнасці і падняць дабрабыт працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці. Для гэтага ўжо сёлета трэба павялічыць вытворчасць прадукцыі не менш як на 5 %, а ў 2020 годзе — не менш як на 3 %».*

# Асцярожна: тонкі лёд!




Старшы матрос дзяржаўнага выратавальнага паста Чачэрска і старшыня раённай арганізацыі АСВОДа Уладзімір ВЕЛІГАЕЎ нясе дзяжурства на беразе гарадскога возера нават зімою — у гэты час ён адсочвае паводзіны людзей на лёдзе, у тым ліку і рыбакоў. Калі ўмовы надвор'я (як, напрыклад, сёння) не спрыяюць выхаду на лёд, ратавальнік устанаўлівае папераджальныя шыльдачкі, робіць вусныя заўвагі парушальнікам, вядзе растлумачальную работу. Уладзімір Паўлавіч амаль дваццаць гадоў працягвае штодзённую вахту.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

• Магіляўчанам прэзентавалі «Букініст» ад «Белкнігі». Буйнейшы ў Беларусі рэалізатар кніжнай прадукцыі гучна заявіў аб сваім вяртанні ў Магілёў.



• **Чэмпіянат сіл спецыяльных аперацый па армейскім рукапашным баі прайшоў у Віцебску.**

• Даследчая група НТФ МІ ўключыла рэзідэнта Парка высокіх тэхналогій — беларускую кампанію Synesis у спіс лідараў рынку сістэм інтэлектуальнага відэаназірання і аналітыкі.

ISSN 1990 - 763X

Разумныя грошы

# А КРЭДЫТ ВАМ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

### Памятку крэдытаатрымальніку ад Нацбанка павінен пачытаць кожны «фінансіст»

**З якой бы прычыны вы ні вырашылі скарыстацца крэдытам, трэба выразна ўсведамляць: яго неабходна вяртаць строга ў адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора, а таксама выплаціць банку працэнты за карыстанне пазычанымі грашыма. Перад гэтым сур'ёзным крокам варта рэальна ацаніць стабільнасць сваіх даходаў і магчымасць своечасова ажыццяўляць плацяжы па крэдытным дагаворы. Добра б яшчэ прааналізаваць магчымыя фінансавыя рызыкі...**

Летась зацверджаны новыя правілы выдачы крэдытаў, акрамя таго былі ўнесены змены ў Банкаўскі кодэкс. У сувязі з гэтым Нацыянальным банкам была падрыхтавана памятка крэдытаатрымальніку. Мы падрыхтавалі агляд асноўных нюансаў гэтага дакумента.

## Не спяшайцеся і вывучыце пытанне

Калі вы прынялі рашэнне ўзяць крэдыт, абярыце найлепшую прапанову. Банкамі краіны прапануецца досыць вялікі выбар крэдытных прадуктаў на розных умовах. З умовамі выдачы крэдытаў можна азнаёміцца на афіцыйных сайтах банкаў (спасылкі размешчаны на сайце Нацыянальнага банка www.nbrb.by ў раздзеле «Банкаўская сістэма»). І яшчэ. Звяртайцеся да супрацоўнікаў банка па тлумачэнне незразумелых умоў.

Перад падпісаннем крэдытнага дагавора неабходна старанна вывучыць яго. Для гэтага вазьміце тыпавую форму крэдытнага дагавора дадому і ўважліва вывучыце ўмовы, якія датычацца адказнасці.

СТАР. 3

Спецыяльны рэпартаж

# «Раней ад прышчэпак адмаўляліся»

### Як працуе ветслужба ў Стаўбцоўскім раёне, дзе цяпер каранцін

**«За вамі воўк, не баіцеся?» — усміхаецца мінак, ківаючы на вялікага чорнага сабаку, што бяжыць за намі па чыгуначным пераходзе. Ведаем, што жарт, але, калі сабака мінае нас, не звярнуўшы ніякай увагі, уздыхаем з палёгкай. У Стоўбцах і вёсцы Слабада, дзе ў мінулыя выхадныя воўк накінуўся на чатырох чалавек, на два месяцы ўвялі каранцін. Жывёл нельга вывозіць у іншыя раёны, на выстаўкі, а ветстанцыя праводзіць актыўную вакцынацыю — ахапілі таксама суседнія вёскі Задвор'е і Акінчыцы. «Звязда» паглядзела, што адбываецца ў рэгіёне ў гэтыя дні.**

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Пасля здарэння з воўкам на прышчэпку адразу пагаджаюцца», — кажа вядучы ветэрынарны ўрач-эпізаатолаг Генадзь МАРКОЎСКІ.